ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

31 кастрычніка 1931 г
№ 253 (1523)

Чырвоная зьмена

РГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Заводзяцца пропэлеры вайны...

Капіталізм узбройваец а вышэйшай тэхнікай для крывавай вайны супроць СССР

Арышты, вобыскі, разбой — сыстэма „аховы парадку“

Падзесяцярыць тэмпы зяблівага ворыва

Новая зямля павінна даць новы раджай, якога ня ведала сялянская обная аднаасобная гаспадарка. б забясьпечыць высокі ўраджай, эба аўладаць і правесьці ў жыцьўсе дасягненьні агрономічнай науі. 1929-1930 г. былі гадамі савага паходу комсамолу за агронімум. Зараз ужо комсамол павін выйсьці ў паход за агромаксім.

Соцыялістычны сэктар—саўгасы колгасы—асноўны вытворца сельа-гаспадарчай сыравіны. Вялікія ўгасныя і колгасныя масывы ебы, насычаныя сельска-гаспадаркімі машынамі, даюць поўную магмасьць заваяваць высокі ўраджай. Каб дабіцца гэтага ў 1932 г., эба зараз-жа, з восені, выступіць конкрэтны бой.

Зябліва—гэта адно з мерапрыемваў вытворчага замацаваньня колсаў, адно з мерапрыемстваў пашэньня ўраджаю. Аднак, гэта жнейшае мерапрыемства ў радзе ёнаў комсамольскімі організацыі недаацэньваецца.

Усе тэрміны зяблівага ворыва айшлі, і на 25-е кастрычніка ян выканан усяго толькі на 30,7 оц. У паасобных-жа раёнах (Рэнскім, Боркавіцкім, Чашніцкім, цебскім, Чэвускім і інш. плян блівага ворыва—пад рэальнай грозаю зрыву выканан толькі ад да 10 проц.

Асноўныя прычыны нездавальнянага ходу ворыва, як адзначана пастанове ЦК КП(б)Б (зьмешчай у Зьвязьдзе 28 кастрычніка) раняцца ў тым, што „...вялікае спадарча-палітычнае значэньне блівага ворыва недаацэньваецца есцовымі партыйнымі савецкімі ганізацыямі...“ і таму „...замест льшавіцкай барацьбы за зябліваe рыва і падняцьце цаліны пануе ортуністычная стаўка на сацёк“.

Дырэктывы партыі і ўраду аб тым, каб перакінуць на зябліва 90 проц. трактарнага парку і 50 проц. конскай цяглавай сілы, ня выконваюцца. У Сіроцінскім і Слуцкім раёнах каля паловы трактарнага парку не перакінута на зябліва.

Комсамол саўгасаў, МТС і колгасаў павінен узяць на сябе ініцыятывы барацьбы за зябліва. Трэба разьбіць опортуністычныя развaжаньні аб чарговасьці кампаніі і стаўку на самацёк. Комсамольскія ячэйкі павінны актыўна змагацца за дакладную расстаноўку сродкаў вытворчасьці і сіл на рашаючых вучастках асеньніх гаспадарча-палітычных кампаній, (загатоўкі, зяблівае ворыва). З бальшавіцкай напорыстасьцю выступіць у бой за 100 проц. выкананьне пляну зябліва, за высокі ўраджай 1932 году, за ўжываньне агромаксімуму ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы.

Каб падзесяцярыць тэмпы зяблівага ворыва, комсамольскія ячэйкі саўгасаў МТС і колгасаў павінны зараз-жа скласьці комсамольскія і маладзёжныя брыгады аратых, шырока разгарнуць сярод іх соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Прасачыць і забясьпечыць выкананьне дырэктывы партыі, каб увесь трактарны парк і ня менш 50 проц. конскай сілы перакінуць на зябліва.

Усю гэту работу перавесьці на зьдзельшчыну, разгарнуць шырокае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж МТС, саўгасамі і колгасамі ў выкананьні пляну ворыва.

Правесьці шырокую масавую работу сярод аднаасобнікаў, беднякоў і серадняков, організаваць іх увагу на 100 проц. выкананьне зяблівага ворыва.

Часу засталося мала. Бліжэйшыя дні павінны даць перамогу. Комсамол павінен выйсьці на штурм выканаць плян ворыва, забясьпечыць высокі ўраджай 1932 г.!

Ваенна-паветраныя сілы галоўнейшых дзяржаў

У амэрыканскім „Літэрэры дайджэст“ надрукаваны вытрымкі з японскай газэты „Цюо Корон“, якая, падкрэсьліваючы, што японскія ваенна-паветраныя сілы стаяць на шостым месцы ў шэрагу паветраных флётаў вялікіх дзяржаў, прыводзіць наступныя даныя аб ваенна-паветраных сілах буйнейшых дзяржаў:

Па статыстычных даных на 1-е студзень 1931 г. ва Францыі налічваецца 4500 ваенных аэропляна, у Злучаных Штатах—2500, у Італіі—1800, у Ангельшчыне 1500, у Японіі—1000 (600 —сухапутнай арміі і 400—ваенна-морскага флёту).

У адносінах да грамадзянскай авіяцыі, якая лёгка можа быць прыстасавана для выкарыстаньня ў ваенных мэтах, статыстыка дае наступны малюнак: у ПАЗШ маецца 4000 машын, ва Францыі—1000, у Нямеччыне 400, у Італіі—400, у Ангельшчыне—300 і ў Японіі 100. Выходзячы з агульнае колькасьці машын, на першым месцы знаходзіцца ПАЗШ.

Лік лётнікаў у гэтых краінах складае у Амэрыцы—5000, ва Францыі—1000, у Ангельшчыне—800, у Нямеччыне—400, у Італіі—100, і ў Японіі—300.

Аб разьвіцьці грамадзянскай авіяцыі дае ўяўленьне наступная табліца, якая паказвае даўжыню паветраных шляхоў і пакрытую адлегласьць (па даных на 1928 г.).

	Даўж. паветр. шляхоў у мілях	Пакрытая адлегл. у мілях
ПАЗШ	36000	20242891
Францыя	17200	5862957
Нямеччына	16500	6571283
Італія	8180	1851423
Ангельшчына	5305	1189340
Японія	1311	1147000

У заключэньне газэта піша: „З моманту зьяўленьня аэропляна ў ваеннай справе азначэньне разуменьня „ваенны фронт“ карэнным чынам зьмянілася.

Да ўдзелу аэропляна у ваеннай справе ваюючыя краіны маглі застгавацца ў тыле ў мірнай абстаноўцы, ня бачачы на працягу ўсяе вайны ворага. Ужываньне аэропляна прывяло да неабмежаванага пашырэньня ваеннага фронту. Шматлікія атрады варожых аэропляна могуць у любы момант зьявіцца ў любым пункце далёка ззаду лініі фронту і стварыць паўнейшае спусташэньне гарадоў. У будучай вайне варожыя аэропляны будуць праводзіць масавыя разбурэньні гарадоў пры дапамозе сільнадзеючых газаў“.

Чарговае зьніжэньне зарплаты

НЬЮ-ЁРК. Чыгуначная кампанія „Вэстэрн Юніён“ аб'явіла зьніжэньне зарплаты 50 тысяч рабочым на 10 проц.



Дэмонстрацыя рабочай моладзі у Нямеччыне.

Растуць рады комсамолу і компартыі

БЭРЛІН 29. На масавым мітынгу комсамольцаў Лейпцыгу у комсамол перайшло 30 маладых рабочых. У Саксоніі за першую палову кастрычніка ў компартыю ўступіла 1189 рабочых і работніц. У Клейншлебэне член абшчыннага савету соцыял-дэмократ Штрыкрэт, старшыня мясцовай соц-дэмократычнай організацыі перайшоў у компартыю.

Арышты і поліцэйскі тэрор у Нямеччыне

БЭРЛІН 29. Поліцэйскі тэрор супроць компартыі пануе па ўсёй Нямеччыне. Пасьля вобыску ў памяшканьні ЦК компартыі, у камітэце компартыі у Гельзэнкірхене Брэмэне і раду вобыскаў у кіраўнікоў компартыі, поліцыя ўчора арыштавала ў Гельзэнкірхене 8 актывістых компартыі па абвінавачваньню іх ва ўдзеле ў забойстве поліцэйскага.

Нямецкія самалёты вышукваюць забаставаўшыя параходы

БЭРЛІН 28. Нямецкія ўлады бязвынікова чакаюць звароту выехаўшых з Ленінграду параходаў, на якіх адбывалася забастоўка маракоў. З 42 параходаў прыбыла толькі 17. За апошнія суткі ня прыбыў ніводзін параход. У нямецкіх портах нічога ня ведаюць аб 25 параходах, якія знаходзяцца ў моры. Каманды на судах у адкрытым моры, даведаўшыся аб тым, што іх чакае кара, зноў аб'явілі забастоўку і прымусілі камандзіраў зьмяніць курс. Нямецкія самалёты з поліцэйскімі на борце без вынікова вышукваюць гэтыя параходы.

На абарону СССР

НЬЮ-ЁРК. У сувязі з нарадай між Гуверам і Лавалем орган компартыі „Дэйлі Уоркер“ адзначае, што амэрыканскі імпэрыялізм утварае сусьветны імпэрыялістычны пост для вайны супроць Савецкага саюзу. Газэта заклікае організаваць дэмонстрацыю ў абарону Савецкага саюзу і пад лёзунгам падтрыманьня кітайскай рэволюцыі.

На поўны ход будоўлю ЦЭЦ!



Пабудова Менскай цёплаэлектрацэнтралі павінна вырашыць цяжкасьці ў забясьпечаньні гораду навой энэргіяй, накіраваўшы па новых правадох новыя сотні кілёват электроэнэргіі для варштатаў фабрык і заводаў.

ЦЭЦ зьнішчыць перабоі ў пульсе жыцьця гораду Менску, а гэта важнае.

Будаўніцтву Менскай ЦЭЦ, якое пачалося у 3-м квартале, павінна быць закончана ў апошнім квартале 4-га заключнага году пяцігодкі. Гэта баявая задача комсамольскай організацыі—шэфа электрыфікацыі і ўсей савецкай грамадзкасьці Менску.

Будаўніцтва ЦЭЦ неабходна акружыць штодзённым комсамольскім клопатам, ад гэтага залежыць посьпех.

Складзены ўжо тэхнічны проэкт цёплаэлектроцэнтралі ператварыць у жыцьцё. Гэта найбольш складаная задача, паколькі на гэтым шляху ёсьць значныя перашкоды.

Распачатыя ў 3-м квартале дасьледчыя вышукальныя работы (выбар пляцоўкі, аналіз, экспэртыза, перапрацоўка тэхнічнага проэкту) поўнасьцю не закончаны толькі з-за таго, што канчаткова ня вызначана яшчэ месца пабудовы ЦЭЦ.

Фарсаваць падрыхтоўчыя работы, зьнішчыць тормаз у будаўніцтве галоўнага корпусу Менскай ЦЭЦ

(Па матар'ялах „Л. К.“ ВСНГБ)

На вышукальна-дасьледчыя работы ўжо затрачана ў 3-м квартале 600 тысяч рублёў, з перавыкананьнем плянавага заданьня квартальных работ на 100 тысяч руб.

Аднак, ня гледзячы на перавыкананьне пляна ў гэтай галіне будаўніцтва ЦЭЦ, мы ўсё-ж маем затрымкі ў асноўных галінах працы, а менавіта ў непасрэдным будаўніцтве галоўнага корпусу станцыі.

Намечанае заданьне будаўніцтва галоўнага корпусу ў 3-м квартале на 1 проц., ня выканана з-за адсутнасьці рабочага праэкту, матар'ялаў і канчаткова—вызначанай мясцовасьці. Па гэтай-жа прычыне выкананы толькі на 15 проц. і дапаможныя работы (жыльлёвае будаўніцтва).

Тормаз у выбары пляцоўкі і ў плянаваньні пабудовы павінен быць неадкладна зьнішчан, бо толькі ад пасьпяховага вырашэньня гэтай задачы залежыць посьпех асноўнага будаўніцтва ЦЭЦ.

Неабходна зрабіць карэнны пералом у поглядах ВСНГБ на будаўніцтва менскай ЦЭЦ. Да гэтага часу ЦЭЦ ня ўнесена ў кантрольныя точкі. ВСНГБ адгаварваецца тым, што няма тэхнічнага пэрсоналу, які-б змог праверыць неабходную колькасьць матар'ялаў для будаўнічых работ. Не рэагаваў ВСНГБ таксама і на тое, каб хутчэй дагаварыцца з Бэлторпам забясьпечаньні электроцэнтралі тарпяным палівам.

Толькі з-за гэтага ствараюцца цяжкасьці ў забясьпечаньні будаўніцтва матар'яламі. Лесбел не адпускае лесаматар'яў, асабліва піламатар'яў, што значна адбіваецца на асноўным будаўніцтве ЦЭЦ і падсобных работ, выклікаючы часовае скарочаньне некаторых, вызначаных па квартальнаму пляну, работ.

Пералічаныя вышэй недахопы ў будаўніцтве менскай цёплаэлектроцэнтралі ўскладняюцца яшчэ і тым, што будаўнічыя работы не забясьпечаны дастатковай колькасьцю тэхнічнага пэрсоналу (тэхнікі, інжынэры-будаўнікі). Пастанова ЦК партыі на гэты конт ня выканана Наркомпрацы і Белдзяржбудам.

Комсамольская організацыя павінна асаблівую ўвагу зьвярнуць на тое, каб як хутчэй ліквідаваць прарыў на адным з важнейшых вучасткаў соцыялістычнага будаўніцтва—пабудове менскай ЦЭЦ. Прарыў у выкананьні плянаў 3-га кварталу павінен быць пакрыты ў 4-м. Менскую ЦЭЦ закончым у вызначаны тэрмін! За гэта менская комсамолія ў адказе.

М. П.

БССР уключылася ва ўсесаюзны конкурс

Масква
„Праўда“

Ва ўсесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў, МТС на лепшую работу па організацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў уключаемся. Мабілізаваны дваццаць работнікаў цэнтральных газэт на месяц для ўмацаваньня работы раённых газэт па організацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, узмацненьні барацьбы за пляны загатовак. Пяць раённых газэт на месячны тэрмін пераведзены на штодзённы выхад. Сем раённых газэт прыступілі да выданьня штодзённых апэрацыйных бюлетэняў. Пераключаем цэнт увагі да конкурсу, арганізуем спэцыяльныя палосы ў газэце „Рабселькор“. На ўдзел у конкурсе ўключаем радыё-газэту. Выдаём пяцьдзесят тысяч спэцыяльных макетаў штодзёнак для калгасаў, саўгасаў. Зварочваемся з спэцыяльным лістам аб уключэньні ў конкурс раённых газэт. Выдаём дзесяць тысяч экзэмпляраў умоў конкурса для рассылкі раёнам. Абавязваемся ход конкурса Беларусі асьвятляць у „Праўдзе“.

Культпроп ЦК КП(б)Б ВІТЛІН
Рэдакцыя „Зьвязды“ МІТЛІН
Рэдакцыя „Рабселькор“ ЧАРНЯКОЎ

Сьвінагадоўчы цэх—цэнтр работы

Перанесьці работу комсамольскай ячэйкі на сьвінарнік, дзе рашаецца посьпех барацьбы за тону—апарос

15 лістапада, згодна ўрадавых дырэктыў, павінна быць скончана будаўніцтва сьвінарнікаў для ўкомплектаваньня СТФ колгасаў. Між тым, на мясцох не надаюць гэтаму належную ўвагу. Будаўніцтва зрываецца. Гэтым самым зрываецца ўмацаваньне СТФ.

Комсамольская організацыя не павінна дапусьціць гэтага зрыву. Ніякіх раўненьняў па „вузкіх" месцах. Трэба мобілізаваць унутраныя рэсурсы (цьвікі, шкло, рабочую сілу) працаваць круглыя суткі і выканаць плян будаўніцтва да тэрміну.

За двухмесячнік штурму дабіцца перамогі

Згодна кантрольнаму пляну, колгасны сэктар Любанскага раёну павінен быў укомплектаваць свой гурт 2150 сьвінаматкамі. На сёньня плян комплектаваньня выканан толькі на 69 проц.


У раёне за 1931 г. намечана было пабудаваць 20 сьвінарнікаў на 2150 галоў, распачата-ж будаўніцтва толькі 4-х на 550 галоў. Усе аб'екты будаўніцтва па пляну павінны быць скончаны не пазьней 1-га лістапада, але па большасьці колгасаў гэты плян зрываецца. Сьвінарнікі к тэрміну ня будуць гатовы.

3 вызначаных 24 сілосных ям, умяшчальнасьцю ў 2212 тон, пабудавана толькі 7, з 38 траншэй на 9335 тон пабудаваны 19 на 2854 тоны.

Ганебна плятуцца ў хвасьце сілосаваньня колгасы: „Зьвязда" (замест 270 тон па пляну засіласаваў толькі 90) і „12-годзе Кастрычніка" (заданьне ў 248 тон выканаў толькі на 30 проц), І толькі колгас) „Чырвоная Слабодка" выканаў плян сілосаваньня на 150% і „Чырвоны сейбіт" на 120 проц.

Як-жа ўдзельнічае комсамольская організацыя ў барацьбе за разьвіцьцё соцыялістычнай сьвінагадоўлі? Колгасныя ячэйкі „Чырвоная зорка", „Асьвета", „Сталёвы конь", „Комінтэрн", „Дружба", камуна БВО сапраўды зразумелі гаспадарча-політычную важнасьць разгортваньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі, уключыліся ў штурм і па-баявому ўзяліся за ліквідацыю прарываў у сьвінагадоўлі. Комсамольскія ячэйкі гэтых колгасаў правялі вялікую работу па ўкомплектаваньню гурту за лік неабагуленай часткі сьвіней колгасьнікаў, паставілі работу сьвінарнікаў на належную вышыню, перавялі ўсю працу на зьдзельшчыну, ужываюць мэтоды соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Ячэйкамі колгасаў „Асьвета" і „Чырвоная зорка" праведзены суботнікі па падрыхтоўцы сьвінарнікаў да зімы.

У выніку добра пастаўленай працы і актыўнай дапамогі комсамольскіх ячэек рад колгасаў дасягнуў значных



вынікаў ва ўкомплектаваньні сьвінога гурту. Колгас „Чырвоная зорка" плян укомплектаваньня выканаў на 99 %. „Асьвета" на 96, „Сталёвы конь" на 93, „Комуна БВО" на 91, „Комінтэрн" —91.

Ячэйкі колгасаў „Чырвоная зорка", „Дружба", „12 годзьдзе Кастрычніка" і „Комуна БВО" для фактычнай дапамогі колгасьнікам і ўзмацненьня адказных вучасткаў барацьбы за сьвіньню вылучылі па некалькі комсамольцаў на сталую працу ў сьвінарніках.

Каб узмацніць сьвінагадоўчыя таварныя фэрмы адпаведнымі кадрамі сьвінароў, райколгассаюз праводзіць месячныя комсамольскія курсы па сьвінагадоўлі.

Паасобныя ячэйкі займаюцца пакуль што толькі агульнымі разважаньнямі вынесьлі прыгожыя пастановы аб мобілізацыі комсамольцаў для працы ў сьвінарніках, але ніводнага пункту сваіх пастаноў ня выканалі. Да такіх адносяцца ячэйкі колгасаў „Сталёвы конь" і „Асьвета".

У галіне ўкомплектаваньня гурту асабліва адстаюць колгасы: „Чырвонае Палесьсе" (плян укомплектаваньня выканаў толькі на 36 проц.), „Пе шае жніўня" 41 проц.) „Комсамолец" (43%), „Ленінскі Шлях" (44 проц.). Гэтыя лічбы яскрава гавораць аб ганебных прарывах, аб тым, што некаторыя комсамольскія ячэйкі не павярнуліся яшчэ да асноўнай, цэнтральнай галіны сваёй гаспадарчай работы—сьвінагадоўлі, не паставілі яе ў цэнтр увагі, не расгарнулі масавай работы па азнаямленьню колгасьнікаў з задачамі, якія ставяцца перад імі партыяй і урадам.

Усім комсамольскім ячэйкам у самы кароткі тэрмін пасрэдна па баявому ўключыцца ва ўдарнае правядзеньне абвешчанага ЦК КП(б)Б 2-х месячніка ліквідацыі прарыву ў жывёлагадоўлі і накіраваць усе свае сілы на гэты адказьнейшы вучастак гаспадарчай работы. Патрэбна зараз-жа ўключыцца ва ўсесаюзны конкурс, абвешчаны газэтай „Комсамомольская праўда", на барацьбе за тону-апарос, павесьці работу па ўкомплектаваньню гурту, дапамагчы колгасам па-ўдарнаму скончыць будаўніцтва сьвінарнікаў, мобілізавацца на пасьпяховае і датэрміновае выкананьне ўсіх плянаў укомплектаваньня сьвінога гурту, будаўніцтва сьвінарнікаў і дабіцца, каб ні адзін комсамолец не стаяў з боку ад гэтай адказьнейшай працы.

Юнкорбрыгада „ЧЗ" Х і Д

Апошнія дні сэзону

скарыстаць для поўнай ліквідацыі бездарожжа

Засталіся лічаныя дні будаўнічага сэзону. У радзе раёнаў пляны дарожнага будаўніцтва яшчэ ня поўнасьцю выкананы.

Комсамольскія організацыі паасобных раёнаў недастаткова мобілізавалі працу ных на поўнае выкананьне пляну рамонту і будаўніцтва дарог.


Матар'ялы, якія сёньня мы друкуем, гавораць аб тым, што на ўсе організацыі ўключыліся ў суботнік штурму бездарожжа. Паасобныя організацыі ганебна ігнаруюць рашэньні ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ аб разгортваньні дарожнага будаўніцтва.

У дні, якія засталіся да выпаду сьнегу, комсамольскія організацыі павінны наверстаць прапушчанае. Ні ў адной організацыі не павінны пляны дарбуду застацца нявыкананымі.

Мільёны рублёў страт—вынік бездарожжа

Дрэнны стан дарог рэзка адбіваецца на эксплёатацыі аўтотранспарту.

Паасобныя часткі машын ламаюцца, з-за чаго машыны доўга



праставаюць у рамонце. У вясновы і восеньскі бездарожжа аўтотранспарт зусім спыняе сваю работу. Неабходны груз застаецца нявывезеным.

Акрамя гэтага, на дрэнных дарогах выдаткоўваецца большая колькасьць гаручых матар'ялаў.

Вынікам дрэнных дарог зьяўляюцца наступныя паказчыкі БССР:

а) дзён працы ў месяц: 15-20;

б) Праца ў дзень не перавышае 8-10 гадзін;

в) месячны кілёметраж дасягае толькі 100 км;

г) выдаткі павялічваюцца ў 2-3 разы.

Прыведзеныя лічбы гавораць аб ... зрыве, які кожную весну і восень пагражае выкананьню пляну перавозак. Перад працоўнымі Савецкай Беларусі стаіць задача хутчэйшай ліквідацыі бездарожжа.

Гольдзін

... Так хутка загразне і кіраўніцтва

Ад Слуцку да саўгасу „Пакрышкі" зараз нельга ні праехаць ні прайсьці. Гразь запрудзіла праезд.

Кожны дзень хурманкі, якія звозяць бульбу для здачы ў саўгас абарочваюцца на гэтай дарозе. Акрамя гэтага, у самым саўгасе нават супроць канцылярыі, кожны дзень купаюцца ў гразі колгасныя падводы. Кіраўніцтва саўгасу не думае прывесьці ў належны выгляд дарогу нават на тэрыторыі самога саўгасу.

Ня цікавіцца станам дарог і крышаўская комсамольская ячэйка. Комсамольцы гэтай ячэйкі на суботнік па ліквідацыі бездарожжа яшчэ на выходзілі.

Слуцкаму райкому ЛКСМБ неабходна тэрмінова ўказаць аб разгортваньні дарожнага будаўніцтва.

Я. Траяноўскі
С. Статкевіч
П. Бранавец

Прыцягнуць да адказнасьці разбуральнікаў дарог

Увосень 1928 году была пракладзена добрая дарога праз рачку Случ, даўжынёй 1,5 клм. Слуцкі РВК патраціў на гэтую дарогу шмат грошай.

Але на глядзячы на добрую якасьць, сяляне прымежных вёсак не асцярожна адносяцца да гэтай дарогі. На паверхні дарогі кожны дзень вырываецца слупы, разбураецца каменная абкладка, разрываецца брук.

Шыжгонкаму і Палікарпаўскаму сельсаветам неабходна прыняць рашучыя захады да тых, хто разбурае дарогу. Сельскія саветы павінны вылучыць вагаядкаў, адказных за цэласьць дарогі.

С Статкевіч П. Бранавец, Я. Траяноўскі

Ячэйка на бездарожжы, РК... у тупіку

Уключаючыся ў штурм бездарожжа, Чачэрская комсамольская організацыя паставіла перад сабой задачу: адрамантаваць усе дарогі і масты на тэрыторыі Чачэрскага сельсавету. Комсамольскія ячэйкі павінны былі прыступіць да рамонту 25 кастрычніка.

Але, дзякуючы нядбайным адносінам да дарожнага будаўніцтва старшыні сельсавету Гунькова, першы выхад на працу быў сарваны.

Ня дзе належнай дапамогі таксама і РВК. Райком комсамолу прабаваў зьвярнуцца за дапамогай у організацыі штурму бездарожжа ў РК КП(б)Б. Але даклад... записку. Але, сакратар РК паклаў яе пад сукно.—„У мане часу ня хапае на гэтую справу, пастаўце пытаньне на нашым бюро, якое адбудзецца ў лістападзе".

Такім права-опортуністычным адносінам парторганізацыі і комсамол павінны даць рашучы адпор. Апошнія дні будаўнічага сэзону па бальшавіцку скарыстаць для поўнага закончаньня пляну будаўніцтва і рамонту дарог.

Эцін.


Петрыкаўцы ігноруюць дырэктывы ЦК ЛКСМБ

Петрыкаўская комсамольская організацыя яшчэ на ўключылася ва ўсебеларускія комсамольскія суботнікі па барацьбе з бездарожжам.

РК ЛКСМБ ня даў кожнай ячэйцы конкрэтных плянавых заданьняў і ўказаньняў па рамонту і будаўніцтву дарог. Дырэктывы ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ аб разгортваньні дарожнага будаўніцтва ў раёне распрацаваны да кожнай ячэйкі не давядзены. У ячэйках пануе спакой мацёк.

Зыходзяць апошнія дні будаўнічага сэзону. Райкому комсамолу неабходна тэрмінова ўключыцца ў штурм бездарожжа, вывесьці на рамонт дарог.

А. Пялінскі.



Стаць на чале актыўнасьці мас

14-ю гадавіну Кастрычніка сустрэнем усебеларускім чырвоным абозам збожжа, лёну і мяса

Здамо дзяржаве датэрмінова лён і каноплі

Выклікаем на соцспаборніцтва ячэйкі КСМ Гомельшчыны

Агульны сход комсамольскай ячэйкі Прудкоўскага сельсавету Гомельскага раёну, абгаварыўшы стан ільназагатвак прыняў рад захадаў для ліквідацыі прарываў у разгортваньні загатовак.

Каб датэрмінова выканаць плян загатовак, бярэм на сябе абавязацельствa: да 3-га лістапада дабіцца ў сваім сельсавеце поўнага выкананьня пляну загатовак насеньня лёну і канапель; разгарнуць шырокую масавую першапачатковую апрацоўку ільнавалакна. Плян загатоўкі выканаць на 100 проц. да 1-га сьнежня.

Разгортваем масава-растлумачальную работу сярод колгасьнікаў, беднякоў і серадмякоў аднаасобнікаў, організуем масавыя вечары па апраўцы тэхнічных культур, выступаем у бой за перавод ўсёй работы па пераапрацоўцы на зьдзельшчыну.

Зараз-жа вылучаем шэсьць брыгад з комсамольцаў і колгаснае моладзі для правядзеньня масава-політычнай работы і непасрэднай апрацоўкі ільнавалакна.

Бяручы на сябе вышэйадзначаныя абавязацельствы, выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва Наклюбінскую і Прыбыткоўскую комсамольскія ячэйкі і ўсе ячэйкі Гомельскага р-ну.

Арбітрам соцыялістычнага спаборніцтва вылучаем „Палескую праўду", гарком ЛКСМБ і „Чырвоную Зьмену".

Па даручэньню агульнага сходу прэзыдыум.

Краснапольская комсамолія слаба ўдзельнічае у нарыхтоўках

Процант выкананьня нарыхтовак па Краснапольскім раёне яўна нездавальняючы. На 25-е кастрычніка выканана загатоўлена збожжа ўсяго 43,5 проц. пляну, бульбы загатоўлена па сыстэме райспажыўсаюзу на 20-е кастрычніка 57,2 проц., райкоопсаюзу—66 проц.

Яшчэ горш справа з нарыхтоўкай тэхкультур. Нельга прызнаць здавальняючым выкананьне на 32,1 проц., асабліва ўлічыўшы, што гэты раён—ільняны.

Комсамольская організацыя аб'явіла няцідзеньнік уборкі і нарыхтоўкі бульбы, разаслала спэцыяльныя брыгады па с-саветах. У выніку некаторыя сельсаветы набліжаюцца да выкананьня нарыхтоўкі бульбы.

Аднак, Горанскі с.-савет, суцэльна колектывізаваны, да 25-га кастрычніка ня скончыў уборкі бульбы і амаль не пачынаў апраўкі яе ў пролетарскія цэнтры. Комсамольская ячэйка гэтага с-савету нічога ня робіць для ліквідацыі прарыву.

Калі раённая комсамольская організацыя і ўдзяляе некаторую ўвагу бульбанарыхтоўкам, дык у адносінах тэхкультур абмежавалася толькі рэдам пастаноў.

Патрэбна зараз-жа накіраваць увесь актыў у с.-саветы, каб ўзмацніць тэмпы выкананьня ўсіх нарыхтовак, асабліва тэхнічных культур.

К.

Організуем усераённы чырвоны абоз

БАБРУЙСК 29. (Па тэлефону ад нашага спэцкора)—Комсамол Бабруйшчыны разам з партыйнай організацыяй ўзяў на сябе абавязак: да 2-га лістапада поўнасьцю выканаць пляны збожжазагатовак.

Для практычнай дапамогі с-саветам у організацыі чырвоных абозаў хлеба РК ЛКСМБ паслаў 22 комсамольцаў. Піонэрская організацыя раёну таксама ўключылася ў гэту работу і насылае ў с-саветы 10 піонэраў.

Організуецца ўсераённы чырвоны абоз здачы хлеба дзяржаве

Д.

Да Кастрычнікаўскіх сьвят выканаць плян

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). Раён яшчэ не распачаў нарыхтоўкі ільнавалакна. Большасьць колгасаў марудзяць з апрацоўкай лёну. Нават ня ўвесь лён зьвезен з поля. Нарыхтоўчыя організацыі бязьдзейнічаюць. Толькі адзін Халбнянскі нарыхтоўчы пункт разгарнуў масавую работу вакол нарыхтовак ільнавалакна, рад колгасаў прыступіў да здачы лішкаў лёну.

Нарыхтавана Лядзянскім пунктам семя яшчэ не падвезена да станцыі.

Колгас „Чырвоная ніва" Баеўскага сельсавету, значна зацягвае апрацоўку лёну. Пабудову ільнасушні не закончылі, хаця ёсьць усе матар'ялы для гэтага. Брыгады ільнамяльшчыкаў ня створаны, пануе абязьлічка, няма зьдзельшчыны, рабочая і цяглавая сіла не скарыстоўваецца. У апрацоўцы і здачы лёну трэба зрабіць адпаведныя зрух. Да 14-й гадавіны Кастрычніка колгасы павінны апрацаваць і здаць лён.

„Ішоу па вуліцы... Культпроп“

Кіраўнікі для політгурткоў у Добрушы вярбуюцца... на вуліцах

Да суровай адказнасьці опортуністых, якія зрываюць марксысцка-ленінскае выхаваньне комсамольскіх радоў

Раўненьне па лепшых

Гомельская організацыя ЛКСМБ заячасова занялася організацыяй зімовай політвучобы.

Аднак рэйд юнкораў „Чырвонай Зьмены“, а таксама нарада АПОячэек колектываў паказалі, што рад ячэек сё-ж опортуністычна недаацэньваюць політвучобу.

У Гомельскую організацыю за пэрыод пасьля апошніх комсамольскіх зьездаў улілося каля 4000 новых комсамольцаў. 50-55 проц. усяе організацыі складаюць навічкі. Здавалася-б што пры такім становішчы трэ' было-б мобілізаваць усю організацыю на марксысцка-ленінскае выхаваньне маладых комсамольцаў. Аднак, кіраўніцтва фабрыкі „Вэзуві“, Добруша, „Пролетары“ і інш. гэтага не зразумелі. Работа з навічкамі адсоўваецца з задні плян.

Побач з дрэнна працуючымі колективамі мы маем і такія, па якіх трэба трымаць раўненьне. Гэта фабрыка „Комінтэрн“, „Сельмаш“, „Комбінат“, Кампрамсаюз і г. д.

Колектыў заводу Ланцуцкага таксама спачатку нядрэнна ўзяўся за політвучобу: правялі масавую растлумачальную работу, організавалі вечар вучобы, добра ўкомплектавалі школу. На гэтым, аднак, і супакоіліся. Заняткі праходзяць з рук вон дрэнна. Наведваюць 15-30 чал., замест 80.

Усяго па горадзе павінны існаваць 5 школ пры прадпрыемствах і адна агульна гарадзкая, якая павінна ядналаць дробныя колектывы. Аднак на сёньня працуе толькі 17 школ. Усе школы забясьпечаны прапагандыстымі ў ліку 36 чалавек. Для кіраўнікоў школ створан працсэмінары і мэтодычнае бюро.

Актыў у асноўным ахоплен партсеткай, частка займаецца завочным навучаньнем.

Гарком комсамолу абвясьціў конкурс на лепшую пастаноўка вучобы ў ячэйках. Устаноўлена 7 прэмій для лепшых ячэек. Адстаючыя колектывы павінны раўняцца па лепшых.

— Такая задача нашай організацыі.

Заг. АПТУ ГК ЛКСМБ **Мікушынскі**

Ягнаць упушчанае

Колектыў Белдзяржбуду—адзін з буйнейшых колектываў Гомельскай організацыі. Колектыў па-бальшавіцку змагаўся за выкананьне пастановы IX зьезду УсеЛКСМ аб матыліьёным.

Аднак трэба падкрэсьліць, што колектыў за апошні месяц зьнізіў работу па росту. Так 3 5 верасьня па 5 кастрычніка ў комсамол прынята ўсяго 4 чалав.

Брыгада „ЧЗ“ **Вермул, Прыгожы.**

Прыклады як трэба і як ня трэба працаваць

Бюро колектыву фабрыкі „Вэзуві“ ўвесь час ігноруе політвучобу. Сакратар колектыву тав. Альшанская політвучобай комсамольцаў і навічкоў ня цікавіцца.

Ня лепш і на заводзе „Колпраца“. Колектыў вучобу яшчэ не распачынаў.

На комбінаце „Спартак“ вучоба распачата, але наведваньне нікудышнае. Замест 60 чал. на заняткі зьяўляюцца 15—20.

Добра працуюць школы у колектывах „Рухавік рэволюцы“, дзе для навічкоў створана 11 гурткоў, дрэваапрацоўчы комбінат, дзе школамі ахоплена 120 чал. і інш.

Гэтыя колектывы змагаюцца што дзённа за якасьць вучобы, за 100 проц. ахоп усіх навічкоў школамі.

Брыгада „ЧЗ“ **Сарайкоў, Белянкоў, Вішнеўская, Раунаў, Врубель, Красапольская**

Сцэнкі Добрускай рэчаіснасьці

Комсамольская політвучоба ў Добруск й організацы з-за дрэннага кіраўніцтва бюро колектыву знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Організаваная пры колектыве політшкола, разьлічаная на поўны ахоп усіх комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі, зусім не працуе.

Прычыны: замест 120-ці на заняткі прыходзяць... 10-15. Школа ня мае пэўнага кіраўніцтва.

Кіраўнікоў ловяць на вуліцы ў дзень заняткаў. Прычым адбываецца прыблізна такі дыялёг:

—Браток, зрываецца політвучоба не падвядзі—правядзі адны заняткі.

У „паходзе“ за кіраўнікамі...

—А на якую тэму?

—Ну, хоць-бы... На якую-б гэта тэму?

—Ага, зараз найбольш важным зьяўляецца прамова тав. Сталіна.

—Не, браток, на політчысле пэўна будзь больш навічкі, дык лепш было-б прапрацаваць устаў і програму,—гаворыць арганізатар комсамольскай школы“.

—Ну, хай будзе так!

Вось як добрускія кіраўнікі організоўваюць політвучобу.

Сталага, конкрэтнага, опэрацыйнага пляну для заняткаў няма. Ніякай растлумачальнай работы напярэдадні заняткаў у колектыве не праводзіцца. АПО-работнік колектыву тав. Катляроў не займаецца і ня цікавіцца пытаньнем політвучобы. Сваю віну ён узвальвае на галовы сакратароў цэхавых ячэек.

Стаўка на самацёк у зімовай вучобе ўвайшла ў сыстэму працы амаль усіх бюро ячэек.

На фабрыцы большасьць комсамольцаў—навічкі, астатняя моладзь нядаўна прышла з вёскі, але ніякай політвыхаваўчай работы з імі не вядзецца. Замацаваньне росту з рук вон дрэннае. Наглядаецца лятуцтва моладзі з прадпрыемства, прагулы, нездавальняючая комсамольскай організацыяй і г. д.

Яшчэ адзін абураючы факт: палова навічкоў няпісьменныя, але ніводная ячэйка не разгарнула лікбезаўскай працы.

Бюро колектыву на чале з сакратаром тав. Казачковым, глядзіць на ўсё гэта скрозь пальцы.

Бюро Гомельскага гаркому комсамолу і парткоміітэту Добрушу павінны заняцца аздараўленьнем кіраўніцтва комсамольскага колектыву.

Брыгада „Ч. З.“ **Клімянок, Норыкаў, Гдзібук, Байко**

Другі хромавы перамог у барацьбе

21 кастрычніка ў Дзяржтэатры адбыўся ўрачысты вечар рабочых чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік“. Рабочыя заводу сьвяткавалі перамогу на фронце выкананьня прамфінпляну.

Прэміяваны 105 лепшых ударнікаў цэхаў чырвонасьцяжнай гарбарні.

Пераходны сьцяг уручаны другому хромавому цэху.

У першым квартале першы хромавы цэх заводу за добрыя паказчыкі ў выкананьні прамфінпляну атрымаў пераходны сьцяг. Па цэхах узьнялася новая хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Пачалося соцыялістычнае змаганьне за перамогу.

Другі хромавы цэх у другім і трэцім кварталах цалком ліквідаваў прарыў першага кварталу. Па некаторых паказчыках другі хромавы цэх стаў першым на заводзе.

Падшэфны рэён першага хромавага цэху колектывізаваны на 51 проц., другі хромавы—на 61 проц.

У першым хромавым цэху пераходны сьцяг заводу зладзены.

Комсамолія цэху разам з беспартыйнай моладзьдзю ўключылася ў бой за датэрміновае выкананьне прамфінпляну. Увесь рабочы колектыў цэху энэргічна змагаўся за перамогу. У выніку на 20 кастрычніка першы цэх выканаў прамфінплян кастрычніка колькасна на 121 проц. і па кошту продукцыі на 114 проц.

Другі хромавы цэх выканаў прамфінплян кастрычніка колькасна на 121 проц. і па кошту продукцыі на 101 проц.

У ліку прэміяваных 105-ці ўдарнікаў шмат комсамольцаў.

Маршруты сталінскай пуцёўкі даведзены да кожнай брыгады. Штодзень праводзяцца дзесяціхвілінныя нарады для абгаварэньня зьменна-сустрэчных пляваў.

Комсамольцы цэху паказваюць прыклады бальшавіцкай барацьбы.

Вось яны—перадавікі

За ўдарную працу ў другім і трэцім квартале прэміююцца лепшыя ўдарнікі комсамольцы заводу „Бальшавік“

Рыўкін Ісак—лепшы ўдарнік гаспадарча - разрахунковай брыгады стругалёў першага хромавага цэху; комсамолец, член бюро колектыву, вытворчы стаж 3 гады; выкананьне прамфінпляну—150 пр. Прэміяваны 3 разы

Энцін—лепшы ўдарнік-комсамолец гаспадарча - разрахунковай брыгады рамшчыкаў першага хромавага цэху; сэкратар цэхавай комсамольскай ячэйкі; вытворчы стаж 7 год; выкананьне прамфінпляну 126%.

Гельфанд - лепшы ўдарнік комсамольскай гаспадарча-разрахунковай брыгады рамшчыкаў другога хромавага цэху; сэкратар цэх'ячэйкі; вытворчы стаж 8 год; выкананьне прамфінпляну—148 проц.

Бурдо —ударнік комсамольскай гаспадарча - разрахунковай брыгады першага хромавага цэху, выкананьне прамфінпляну 106 проц.

Бальшавіцкае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку зьявілася рашаючым зьвяном у барацьбе за выкананьне прамфінпляну. Комсамольцы-ўдарнікі заводу „Бальшавік“ паказалі прыклад барацьбы за гаспадарчы разрахунак.

Кутман.

РЫХТУЙЦЕСЯ! — РЫХТУЙЦЕСЯ!

3 лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары, сэкратар Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ

АДКРЫЕ УСЕСАЮЗНЫ МІТЫНГ КОМСАМОЛУ ПА РАДЫЁ,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

XIV ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІКА

Ля мікрофона выступяць прадстаўнікі ВК КІМ'у прадстаўнікі комсамолі Масквы, Харкава, Тыфлісу, Менску, Ніжняга-Ноўгораду і інш.

Кожная комсамольская ячэйка павінна ўдзельнічаць У МІТЫНГУ

ЯЧЭЙКІ, неадкладна абсталюйце радыё-вузлы, гучнавяшчальнікі!

Мітынг павінна слухаць уся комсамолія і ўся працоўная моладзь Савецкай Беларусі.

Неадкладна за работу, за баявую падрыхтоўку да мітынгу!

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“

Пад знакам барацьбы за промфінплян

Звыш 500 рабочых комсамольскага ўзросту працуе на машынабудаўнічым заводзе імя Варашылава. Складзены 12 маладзёжных брыгад і комун.

Некалькі месяцаў таму назад завод стаяў у глыбокім тыле выкананьня прамфінпляну. Прарыў паглыбляўся. Месячнае выкананьне прамфінпляну выражалася ганебнай лічбай—39 проц.

Комсамолія заварушылася

Тады заварушылася ўся грамадзкасьць заводу. Маладзёжныя брыгады па сваёй ініцыятыве былі пераведзены на соцыялістычны гаспадарчы разрахунак. Па ініцыятыве комсамольцаў таксама былі пераведзены на гаспадарчы разрахунак асноўныя вядучыя брыгады цэхаў. Увядзеньне груповай зьдзельшчыны дало магчымасьць напрыклад, па брыгадзе сьвідравальных варштатаў сьлясарна-зборачнага цэху, зьняць трох чалавек і вывесьці брыгаду з штомесячных прарываў.

Увядзеньне прогрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны па брыгадзе равіясартовак зрабіла тое, што брыгада стала адной з лепшых на заводзе, штомесячна перавыконвае прамфінплян. Гэта брыгада стала першым прэтэндэнтам на міжбрыгадны пераходны сьцяг. Насьценныя газэты былі таксама мобілізаваны на ліквідацыю прарыву. Замест невялікай колькасьці цэхавых насьценгазэт на заводзе зараз выходзіць 16 баявых мобілізуючых штодзёнак. Большасьць рэдактароў і ініцыятараў—комсамольцы.

Ячэйкі перабудоўваюцца

Перабудавалася і праца ячэек. Для ўсіх было вядома, што пры старой сыстэме кіраўніцтва нельга было забясьпечыць баявой работы. У такарным цэху, замест адной, былі організаваны 4 зьменныя ячэйкі. Перанос работы ў зьмену даў сябе хутка адчуць. Зараз ужо усе чатыры зьмены такарнага цэху цалкам акомсамолены. Ліцейная ячэйка, у склад якое ўваходзяць і комсамольцы-мадэльшчыкі, разьбіта на дзьве паасобныя ячэйкі: ліцейшчыкаў і модэльшчыкаў.

Організаваны новыя ячэйкі ў цэху харчаваньня і сярод чорнарабочых. Ячэйка сьлясарна-зборачнага цэху зараз разьбіта на тры ячэйкі, а гэтыя ячэйкі ў сваю чаргу разьбіты на брыгады і групы. Стварэньне 11 комсамольскіх груп у кацельным цэху зрабіла тое, што ячэйка за два месяцы ўзрасла на 65 чал. і налічвае зараз 110 комсамольцаў.

Што робяць групоргі

Групорг—гэта сэкратар у маштабе брыгады. Гэта організатар і кіраўнік. Яму значна лягчэй кіраваць сваімі комсамольцамі, з якімі ён працуе побач, якіх ведае, як кажуць, „на зубок“, чымся былому сэкратару, які павінен быў ахапіць комсамольцаў, раскіданых па ўсім цэху, якіх ён ведаў толькі „па галовах“.

Групорг праводзіць у брыгадзе вытворчыя нарады, вядзе працу па пляніраваньню, па ахапленьню ўдарніцтвам. Ён разьмяркоўвае ўвутры брыгады нагрузкі паміж комсамольцамі, правярае і дапамагае ў іх выкананьні. Кожны групорг праводзіць работу па 100 проц. ахопу рабочай моладзі комсамолам. Ёсьць групоргі, якія вельмі прыкладна паставілі сваю працу. Напрыклад групорг Дукорскі з брыгады Сяліцкага. У гэтай брыгадзе прамфінплян сыстэматычна перавыконваецца. Кожны комсамолец мае адпаведную нагрузку, усе ахоплены політвучобай і тэхвучобай. Але ня ўсе яшчэ групоргі працуюць добра. Ёсьць і такія групоргі, як напрыклад Давідовіч, якія яшчэ нічога ня робіць у брыгадзе.

Работа „у міжнародным маштабе“

Буйны рост організацыі перабудовы работы у нізавых зьвеньнях патрабавалі і перабудовы работы бюро колектыву.

Раней пры колектыве існавала 5 сэктароў: оргінструктарскі, культмасавы, эконом работы, вучобы і кадраў і ваенны. Такія-ж сэктары існавалі і пры ячэйках. Аднак сэктары працавалі, як кажуць наогул, у „міжнародным маштабе“. Напрыклад, сэктар эконемработы займаўся павышэньнем кваліфікацыі зарплатай, плянава-опэрацыйнымі групамі, рацыяналізацыяй, вучнёўствам і г. д.

Бязумоўна, з усіх гэтых работ мала што выконвалася. Кіраўнік, які стаяў на чале такога „усеабдымнага сэктару, пры ўсіх сваіх здольнасьцях ня мог ахапіць усе гэтыя пытаньні.

Сэктары ўзбуйняліся Паўстала пытаньне аб організацыі заводзкага камітэту, і з 26 па 29 адбылася першая агульна-завадзкая комсамольская конфэрэнцыя.

Пэрыод падрыхтоўкі

Пэрыод падрыхтоўкі да конфэрэнцыі азнаймаваўся вялікім уздымам комсамольскай актыўнасьці. Комсамольскія брыгады Цэхановіч і комуны такароў імя Сталіна і Варашылава прышлі на конфэрэнцыю з перавыкананым промфінплянам. Ліцейшчыкі адлілі у падарунак конфэрэнцыі ў нерабочы час сьвідравальны варштат. Комсамольцы сьлясарна-зборачнай ячэйкі № 1 высунулі ў падарунак конфэрэнцыі сустрэчны прамфінплян: 91 сьвідравальны варштат, замест 80.

У рабоце комсамольскай організацыі заводу яшчэ значныя недахопы. Плянава-опэрацыйныя групы вельмі слаба працуюць, яны таксама ня маюць дастатковага кіраўніцтва з боку плянавага аддзелу заводу. Роля іх часта зводзіцца да кур'ераў, бегаюць за нехапаючымі дэталямі.

Такая работа ўжо сёньня зусім нездавальняючая.

Комсамольская організацыя таксама яшчэ не аўладала вышэйшымі рацыяналізацыі і тэхнікай вытворчасьці. Яшчэ недастаткова пастаўлена вайсковая і політвучоба.

Але, ня гледзячы на недахопы у працы комсамолії заводу Варашылава адчуваецца значны зрух. Завод зараз выканаў не 98 проц. прамфінплян і пасьпяхова набліжаецца да 100 проц, выкананьня.

Зараз комсамольскі колектыў ўжо налічвае 450 комсамольцаў. Вялікае жаданьне комсамольцаў працаваць, рашучая перабудова работы, калі цэнтр цяжару перанесен у брыгаду і групу, служыць залогам таго, што комсамольскі колектыў Варашылава пераможа недахопы.

Розенкранц.

З прамовы сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча

на ўсебеларускай нарадзе рэдактароў газэт

Канец. Пачатак глядзі ва ўчарашнім № „Ч. З."

За разгорнутую масавую работу, за разгорнутую пролетарскую самакрытыку, супроць голага адміністраваньня

ЦК КП(б)Б ускрыў за апошні час у радзе раённых організацый (Лельчыцы, Бягомля, Плешчаніцы, Асьвея) рад агідных зьявішч. Толькі учора мы разглядалі ганебныя факты якія мелі месца ў Чырвонапольскім раёне. Мы ўскрылі поўнае ігнараваньне масавай работы і вялізарнае адміністраваньне. Паглыбленая масавая палітычная работа падмянялася вялізьнымі дозамі голага адміністраваньня ў адносінах да аднаасобнага сэктару, у адносінах ад беднякоў і серадняков.

Выкрытыя намі за апошні час факты гавораць аб тым, што неабходна яшчэ больш рэшуча, у самай вострай форме ўдарыць па існуючых фактах голага адміністраваньня.

Мы распусьцілі бюро Чырвонапольскага райкому партыі, прэзыдыум РВК і прэзыдыум РКК.

Вывад з усіх гэтых прыведзеных прыкладаў наступны: мацней, больш настарожаней—неаслабную клясавую чуласьць да ўсіх праяўленьняў клясавай барацьбы.

Яшчэ больш жорстка і настойліва весьці неаслабную барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай ўнутры партыі—правым опортунізмам, „левымі" загібамі і прымірэнцтвам да якіх-бы там ні было адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, рашуча ачышчаючыся ад паасобных, нягодных комуністых выкрываць і ачышчаць ад кулацкіх элемэнтаў і іх падпявал.

Шырэй разгортваць пролетарскую самакрытыку, за яе дзейснасьць, шырэй разгортваць паглыбленую масавую работу.

Асаблівы ўпор на практычнае ажыцьцяўленьне авангарднае ролі комуністых

Пастаўленыя комуністычнай партыяй гістарычныя задачы змогуць і ў далейшым з посьпехам ажыцьцяўляцца толькі ў тым выпадку, калі авангард рабочае клясы сапраўды будзе мобілізаваны па-баявому на ажыцьцяўленьне і правядзеньне генэральнай лініі партыі, калі на справе кожны комуністы будзе ўсімі сіламі, з усёй адданасьцю змагацца за генэральную лінію нашай партыі. Вось чаму ў час перавыбараў парторганаў мы павінны асабліва моцна паставіць пытаньне аб авангарднай ролі комуністых.

Адным з пытаньняў, на якім мы сконцэнтроўваем вялікую ўвагу, зьяўляецца пытаньне аб павышэньні ўзроўню тэорэтычнага марксыцка-ленінскага выхаваньня. У нас у гэтых адносінах ужо зроблены некаторыя крокі, але трэба гэтыя першыя дасягненьні на што-б там ні стала грунтоўна замацаваць.

Падрыхтоўка і правядзеньне перавыбарчай кампаніі партыйных органаў павінна быць так пабудавана, ікаб мы здолелі праверыць усе зьвеньні нашай партыйнай організацыі, каб мы здолелі праверыць, як расстаўлены ў нас сілы і як гэтыя сілы выконваюць заданьні партыі.

Мы павінны пры перавыбарах партыйных органаў асабліва завастрыць увагу на далейшым умацаваньні вясковых партыйных організацый, на правільнай і гібкай расстаноўцы ўсіх сіл якія мы маем у вёсцы, у раёне і асабліва завастрыць увагу, прыняўшы рад конкрэтных мерапрыемстваў па ўмацаваньне работы апорных пунктаў у вёсцы—сельпаркомаў. Гэта забясьпечыць і пасьпяховае выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных кампаній і конкрэтнае спэцыялізаванае кіраўніцтва колгасамі, гэта ў агульным выніку яшчэ больш павысіць бальшавіцкую баяздольнасьць вясковых партыйных організацый.

Кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам—адна з першачарговых задач усёй КП(б)Б

Задача нашага друку раённых і цэнтральных газэт заключаецца ў тым, каб у часе правядзеньня перавыбараў партыйных органаў мобілізаваць увагу ўсёй партыйнай організацыі, усёй пролетарскай грамадзкасьці на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач. Зусім зразумела, што ўвагу органаў друку і ўсёй арміі рабселькораў павінна яшчэ больш мобілізаваць на павышэньне клясавай чуласьці. Само самой зразумела, што друк сваю ўвагу павінен накіраваць на выяўленьне і выкрыцьцё скажэньняў, якія мы маем у рабоце пасобных організацый і г. д. Само сабой зразумела, што друк, даючы разам з гэтым разгорнуты паказ станоўчых узораў работы, ва ўсёй сваёй рабоце павінен ад пачатку да канца, выходзіць з неабходнасьці барацьбы за высокія напружаныя тэмпы работы, якія мы маем у IV квартале і ў сувязі з падрыхтоўкай да новага гаспадарчага году.

Як і раней першачарговыя задачамі да ўсяго нашага друку зьяўляецца ажыцьцяўленьне ў сваёй рабоце на разных організацыйнасьці і спэцыялізацыі.

Мне-б хацелася з асаблівай сілай заваструць увагу ўсёй партыйнай організацыі і ў прыватнасьці ўвагу цэнтральных раённых і шматтыражных і насьценных газэт на пытаньнях кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

ЦК КП(б)Б вызначае шмат увагі пытаньням кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам. Між тым, матар'ялы сыгналізуюць аб тым, што з боку раду цэнтральных газэт, у значнай частцы раённых газэт і ў шматтыражак партарганізацый за апошні час значна аслабла сыстэматычная штодзённая работа з рабселькорамі і нізавым друкам.

У нас ёсьць рад важнейшых дакумантаў ЦК КП(б)Б па пытаньнях рабселькораўскага руху, раённага і нізавога друку і ў падрыхтоўцы кадраў для друку. Зараз мы разам з ЦК КП(б)Б агрунтоўваем увагу на ўвагу на разгорнутае масавае праверкі ўсіх раней прынятых партыйных пастаноў па пытаньнях друку і рабселькораўскага руху.

Ва ўсёй рабоце па ацэнцы якасьці работы партыйных організацый і ў прыватнасьці раённых газэт, а таксама прафсаюзных організацый гаспадарнікаў і г. д. па пытаньнях рабселькораўскага руху мы выходзім і будзем выходзіць з таго, што самае дробнае праяўленьне недаацэнкі рабселькораўскага руху, нізавога друку і неабходнасьці ўмацаваньня партыйнага кіраўніцтва імі, павінна палітычна кваліфікавацца, як праяўленьне правага опортунізму на практыцы.

ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове (ліпень 1931 г.) правярыць разам з ЦК КП(б)Б у летнім месяцы 1932 году масавы ўсебеларускі месячнік праверкі і самаправеркі выкананьня пастаноў партыі аб друку і рабселькораўскім руху. Тры месяцы, што застаецца да месячніка, павінны быць выкарыстаны для таго, каб нагнаць прапушчанае, у прыватнасьці ў бясьпечным мы нарадую: а глыбокую, сьвядомую сваю на гру ах падучых прафесый, прапрацоўку і рэалізацыю пастановы II ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду.

Неабходна на справе дабіцца выкананьня неадпаразовых указаньняў ЦК КП(б)Б аб тым, што работа з рабселькорамі, дапамагае і кіраўніцтва паставіць па барацьба за зьвеньня насьць усіх зьмяшчаных у друку матар'ялаў, зьяўляецца адной з першачарговых задач усёй КП(б)Б, кожнай раённай і гарадзкой партыйнай організацыі, кожнай заводзкай і колгаснай ячэйкі.

Організаваць маладзёжную старонку

Пастановы партыі і 2-га рабселькораўскага зьезду комсамольскім колектывам БЖС у жыцьцё не праводзяцца і да гэтага часу яшчэ не распрацаваны.

Ніякай работы з юнкорамі не вядзецца. Нас. ценгазэты выходзяць час ад часу. Маладзёжныя старонкі не організаваны.

Бюро комсамольскага колектыву патрэбна зараз-жа зварухнуцца.

Юнкор Л.

Трывожныя сыгналы з Жыткавіч

Ад спэцыяльнага корэспондэнта „Ч.З."

У палоне прарываў

Кіраўніцтва комсамольскай організацыі ігноруе задачы нацыянальна-культурнага будаўніцтва

Масы колгасьнікаў і батракоў—беднякоў і серадняков-аднаасобнікаў Жыткавіцкага раёну пад кіраўніцтвам райпарторганізацыі дамагліся ў апошнія гады значных заваёў на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. У гэтым навучальным годзе ў раёне працуе 42 школы, 10 хат-чытален і некалькі іншых культасьветных установаў. Працуе 37 беларускіх школ, 2 польскіх, 2 яўрэйскіх, 1 украінская Нядаўна організавана хата-чытальня, якая працуе на польскай мове. Уводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі. З 2750 дзяцей, падлягаючых усеагульнаму пачатковаму навучаньню (8-11 год) школамі ахоплена на 20 кастрычніка 2700, што складае 97 проц. Па другому концэнтру школ дасягнуты 100 процантны ахоп.

Між тым, з боку партыйных і комсамольскіх ячэек задача нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў большасьці выпадкаў не атрымлівае патрэбнага вырашэньня, а дужа часта не атрымлівае зусім ніякае ўвагі. Асобныя партыйныя комсамольскія ячэйкі опортуністычна недаацэньваюць задач нацкультбудаўніцтва, злосна ігноруюць рашэньні кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б і апошніх комсамольскіх зьездаў па нацпытаньню.

Сарвалі маску, а далей?

Славутая вылазка ваяўнічага вялікадзяржаўнага шовіністага „Настаўніка-комсамольца" Чудзіна (Жыткавічы), рашуча асуджаная бальшавіцкім друкам і чырвонаштандартным настаўніцтвам Беларусі, не зьявілася для рэённых партыйных і комсамольскіх організацый вурокам для больш рашучай і бязьлітаснай барацьбы за правільнае, упартае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі партыі. Комсамолія, асудзіўшы вялікадзяржаўніка Чудзіна, прагнаўшы яго з сваіх шэрагаў, не занялася глыбокай прапрацоўкай пытаньняў нацполітыкі, не разгарнула ажыцьцяўленьня рашэньняў 3 цэнтральнага пленуму ЦК ЛКСМБ аб удзеле ў нацкультбудаўніцтве. Больш таго, далёка ня усімі ячэйкамі прапрацаваны гэтыя рашэньні. Комсамольцы Вільчанскай, Чарэцінскай і іншых ячэек ня ведаюць сутнасьці барацьбы з нацыяналістычнымі ўхіламі.

Ні адна з комсамольскіх ячэек раёну не падхапіла ініцыятывы рабочых заводу імя Варашылава, накіраванае на разгортваньне шырокага добраахвотніцкага ўдарніцкага руху да аўладаньня вышынямі беларусізацыі. Комсамольскія ячэйкі не займаюцца вырашэньнем пытаньняў беларусізацыі, узьняцьцем яе (беларусізацыі) на вышэйшую ступень. У організацыі зламана ігноруюцца задачы, пастаўленыя партыяй і комсамолам, па вывучэньні культуры і гісторыі Беларусі. Гэтакіх гурткоў і брыгад у раёне не існуе.

Ціша ды гладзь...

Праца сярод працоўных нацменшасьцяй, якая павінна быць магутным вагаром у ажыцьцяўленьні задач соцыялістычнай рэконструкцыі вёскі, ня гледзячы на ўсё яе вялізарнае палітычнае значэньне і складаны нацыянальны пераплёт, у глыбокім заняпадзе. Для Браніслаўскага сельсавету, напрыклад, работа сярод працоўных нацменшасьцяй мае выключнае значэньне, паколькі ў гэтым сельсавеце больш, як у іншых жывуць беларусы палякі, украінцы, немцы. Аднак, ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў партыі, тут гэтая работа амаль адсутнічае калі не гаварыць пра тое, што ў гэтым с-сельсавеце працуе адна украінская аднакамплектная школа (у вёсцы Града) і адна польская двухкамплектная школа (у вёсцы Лагвошча)

Надзвычайна красамоўным паказчыкам таго, як пастаўлена тут праца сярод працоўных нацменшасьцяй зьяўляецца вёска Лагвошча. У гэтай вёсцы жыхары—палякі. З 63 гаспадарак у колгасе 20 (колгас імя Дзяржынскага) Комсамольскай ячэйкі ням, ёсьць тры комсамольцы, як'я спадзяючыся на Браніслаўскую ячэйку, членамі якой яны зьяўляюцца, не вядуць барацьбы за шматмільённы комсамол. Ячэйка-ж ЛКСМБ не зварочвае ўвагі на пастаноўку работы ў гэтай вёсцы, нават не правярае работу сваіх комсамольцаў з гэтае вёскі. У Логвошчы 31 няпісьменных. На вёску выпісваецца толькі 15 экзэмп. польскай газэты „Орка" (іншых газэт на польскай мове тут ня сустрэнеш). Драмгуртку ў вёсцы няма. Хата-чытальня працуе надзвычайна дрэнна, яна яшчэ ня стала месцам культурнага адпачынку колгасьніка-паляка.

Калі дадаць што ў гэтай вёсцы рост колгасу зьяўляецца нездаровым (паступалі шмат якія з тых, якіх давялі да двара і інш.) дык стане зусім зразумелым малюнак таго якая опортуністычная недаацэнка пануе ў Браніслаўскіх с-савецкіх, партыйнай і комсамольскай ячэйках працы сярод працоўных нацменшасьцяй.

Культмасавая—на замку

У цеснай злучнасьці з задачамі працы сярод працоўных нацменшасьцяй стаяць задачы ўсёй сыстэмы культурна-масавай работы. З усёй рашучасьцю трэба падкрэсьліць, што ў Жытковіцкім раёне культурна-масавая работа далёка не належнай вышыні. Работа усіх 10 хат-чытален у заняпадзе. Хата-чытальня ня стала штабам культурнай рэволюцыі. Яе работа не адпавядае ўзрослым культурным запатрабаваньням мас колгасьнікаў. Дужа часта хату-чытальню вартуе замок. У Доме соцыялістычнай культуры ў Браніславе ніякай культмасавай работы, накіраванай на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач (хлебазагатоўкі, організацыйна - гаспадарчае замацаваньне колгасаў і г. д.) не вядзецца. Тут нават чытальня зачынена колгасьніку, няма дзе пачытаць газэту. Радые маўчыць. А некалькі месяцаў таму назад тут ставілі шкодную п'есу. Комсамольцаў-культармейцаў ня відаць. Культкамісія, існуючая пры с/савеце, сьвяткуе гадавіну сваёй опортуністычнай бязьдзейнасьці. Парт'ячэйка і ячэйка ЛКСМБ не займаюцца пытаньнямі культурна-масавай работы.

Ня лепш справа і ў іншых с-сельсаветах. Клюб колгасу Надубаў-Чарэвенка зьяўляецца халодным і няўтульным „прытулкам" для колгасьнікаў у часе сходаў. Чытальні няма. Бібліотэка заўжды на замку. Лёзунгі завешаны павуціньнем. Ледзь дыхае насьценгазэта, выдадзеная яшчэ ў маі месяцы.

Нардом м. Жыткавічы таксама не працуе. РК ЛКСМБ без ведама зацікаўленых установаў аслабаніў ад працы загадчыка і бібліатэкара з гэтага Нардому. У выніку ніякай работы ў Нардоме няма ўжо каля месяца.

Дырэктывы партыі пра ўсеабуч ігноруюцца

Раённая комсамольская організацыя зусім паслабіла і зьвяла на што сваё шэфства над ўсеагульным навучаньнем

Пастанова ЦК УсеКП(б) распрацава... толькі на настаўніцкіх мэтаб'яднаньн... Комсамольскія ячэйкі зусім не за... маюцца рэалізацыяй гэтай пастанов... Ячэйкі не заслухоўваюць пытаньн... работы настаўнікаў-комсамольцаў. П... таньні работы школ у большась... выпадкаў не знаходзяць адбітку... працы ячэек. РК ЛКСМБ ня даў ... казаньняў ячэйкам пра рэалізацы... дырэктыў партыі аб школе. У той-ж... час будаўніцтва школ ідзе дрэнн... Вільчанская школа будуецца на пр... цягу 2-х год. Школа гніе на вач... комсамельскай ячэйкі. Не пабудава... школа ў в. Дуброве. Політэхнізацы... школ яшчэ не разгорнута. Толь... 60 проц. школ заключылі дагаворы... колгасамі.

Комсамольская організацыя ніяка... ўдзелу ня прымае ў ліквідацыі н... пісьменнасьці. У раёне з 2049 няпіс... менных ахоплена лікпунктамі 13... Лікпункты працуюць з перабоямі. ... ячэйках шмат малапісьменных ком... мольцаў, не ахопленых вучобай.

* * *

Гэты пералік фактаў Жытковіцк... сапраўднасьці сьведчыць аб тым, ш... нацыянальна-культурнае будаўніцт... ў раёне паралізавана глыбокімі пр... рывамі, опортуністычнай практык... кіраўніцтва раду ячэяк. Райк... ЛКСМБ, ня гледзячы на цэлы р... выразных і катэгарычных дырэкты... партыі і комсамолу, не мобілізав... комсамольскую організацыю на штур... складаных задач нацыянальна-кул... турнага будаўніцтва.

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ ... опортуністычную недаацэнку зад... нацыянальна-культурнага будаўніцтв... за ігнараваньне пастаноў комсамол... скіх зьездаў па нацпытаньню павін... прыцягнуць кіраўніцтва Жыткавіцк... райорганізацыі да суровай адказнасьц...

Комсамольская організацыя павін... неадкладна ліквідаваць свае прарыв... па ўдзелу ў нацкультбудаўніцтв... павінна мобілізавацца і мобілізава... усю працоўную моладзь на асно... рашэньняў партыі і комсамолу ... нацпытаньню на штурм задач кул... турнай рэволюцыі, на ўпартае і пас... лядоўнае ажыцьцяўленьне нацполіты... партыі.

Міх. Вярнікоўскі.

ПАВЫШЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ НАСТАЎНІКАМ

Гэтымі днямі Савет народных камісараў Саюзу ССР пастанавіў павялічыць з студзеня 1932 году сярэднюю стаўку месячнай зарплаты па Саюзу ССР для настаўнікоў школ першай ступені да 90 руб. і для настаўнікаў школ другой ступені (другога концэнтру)—да 130 руб. акрамя ўстаноўленых налічэньняў.

Прапанавана ўрадам саюзных рэспублік НКфіну Саюза ССР і Дзяржплану Саюзу ССР у кантрольных лічбах на 1932 год выходзі... з паказаных вышэй сярэдніх ст... вак зарплаты настаўнікам шко... першай і другой ступені, дыфэрэн... цыруючы гэтыя месячныя стаўк... і ўвесь фонд зарплаты па ўзга... неньню паміж НКА саюзных рэ... публік і ЦК саюзу Працасьветы ... адпаведнасьці з раёнамі, кваліфіка... цыяй і якасьцю работы настаўні... каў.

Політэхнізацыя ня церпіць бясплянавасьці

Слуцак. З рук вон дрэнна пастаўлена політэхнізацыя у Слуцкім пэд.тэхнікуме. Студэнты не прымацаваны да прадпрыемстваў і колгасаў. Праваздзімыя сельскагаспадарчыя практыкумы не даюць элемэнтарных ведаў па політэхнізацыі. Студэнцтва выкарыстоўваецца выключна, як рабочая сіла.

Слуцкая МТС адмаўляецца заключыць з тэхнікумам дагавор па правядзеньню практыкуму у колгасах. Майстэрні, як першы крок да політэхнізацыі, у тэхнікуме і практывальнай школе адсутнічаюць. Адміністрацыя тэхнікуму і профком ніякіх захадаў для зьнішчэньня гэ... тых опортуністычных скрыўленьня... задач політэхнізацыі не прымаюць.

Кіраўніцтва практыкумам як ... колгасах, так і на прадпрыемства... ніякага няма, праца адбываецца... стыхійна і бясплянава.

Партыйна-комсамольскі колекты... павінен зараз-жа разгарнуць ба... явую рэалізацыю пастаноў парты... пра ніжэйшую і сярэднюю школу... узьняць масы студэнцтва на бара... бу за якасьць політэхнізацыі.

Брыгада „ЧЗ" Вяроўка, Я. Нові...

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСА...

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.